**Пілігрымка Даверу на Зямлі**
42-ая Еўрапейская моладзевая Сустрэча
Уроцлаў 2019/2020

# Гасціннасць на тэрыторыі непрыяцеля

*А трэба было Яму [Езусу] праходзіць праз Самарыю. Ён прыйшоў у самарыйскі горад званы Сіха́р, паблізу зямлі, якую даў Якуб Юзафу, сваму сыну. Была там студня Якуба. Езус, стомлены дарогай, сядзеў пры студні. Было каля шостай гадзіны. Прыйшла жанчына з Самарыі зачарпнуць вады. Кажа ёй Езус: «Дай Мне піць». Вучні ж Ягоныя адышлі ў горад купіць ежы. Жанчына самаранка сказала Яму: «Як Ты, юдэй, просіш піць у мяне, жанчыны самаранкі?» Бо юдэі не маюць зносін з самаранамі. Езус сказаў ёй у адказ: «Калі б ты ведала дар Божы і хто кажа табе: "Дай мне піць", то прасіла б у Яго, і Ён бы даў табе жывой вады». Жанчына кажа Яму: «Пане, у Цябе і зачарпнуць няма чым, а студня глыбокая. Адкуль жа ў Цябе вада жывая? Няўжо ты большы ад айца нашага Якуба, які даў нам гэтую студню і сам з яе піў, і сыны яго, і статкі яго?» Езус сказаў ёй у адказ: «Кожны, хто п'е гэтую ваду, зноў адчуе прагу. А хто б піў ваду, якую Я дам яму, не зазнае смагі на векі; а вада, якую дам яму, стане ў ім крыніцай вады, якая цячэ ў жыццё вечнае». Жанчына сказала Яму: «Пане, дай мне гэтай вады, каб я не мела больш прагі і не прыходзіла сюды чэрпаць».*

***Ян 4, 4-15***

# Прапановы на лістапад

«Юдэі не маюць зносін з самаранамі». Калі паміж нашымі краінамі няма дыпламатычных адносін, урады раюць паўстрымлівацца ад падарожжа да такое дзяржавы. Езус рызыкаваў, ідучы да самаран. Паміж імі была бездань. У Евангеллі паводле св. Мацвея Езус сказаў: «У гарады самарыйскія не ўваходзьце» (Мц 10,5).

Святы Лука распавядае пра падзею, якая, здаецца, апраўдвае гэтую параду: калі Езус хацеў спыніцца ў адным з самарыйскіх гарадоў, яго жыхары не пагадзіліся на тое (Лк 9, 51-56). А паводле Евангелля св. Яна, адною з найгоршых абразаў сярод яўрэяў было назваць кагосьці самаранінам (Ян 8, 48).

Якую ж розніцу мы бачым у гісторыі сустрэчы пры студні Якуба! Езус не толькі ходзіць па Самарыі, але добразычліва там прыняты і застаецца на два дні. З гістарычнага пункту гледжання, малаверагодна, каб многія самаране верылі ў Яго, як піша евангеліст (Ян 4, 39). Паводле Дзеяў Апосталаў, ужо некалькі гадоў пазней «Самарыя прыняла слова Божае» (Дз 8,14).

Аднак св. Ян, як гэта часта бывае з біблейскімі аўтарамі, распавядае «па-прароцку»: ён накладае на сябе і аб'ядноўвае ў адзін вобраз кароткі побыт Езуса ў Самарыі і гасціннасць, праяўленую пазней Яго вучням. Першымі вучнямі, якіх выгналі са сваёй краіны, былі габрэі, гэтаксама, як Езус. Яны павінны былі пакінуць Ерузалем і паехаць у Самарыю, бо верылі ў Яго.

У той час, калі пісаў св. Ян, у канцы першага стагоддзя многім пераследаваным хрысціянам давялося шукаць замежнай гасціны. Гісторыя пра тое, як Езус таксама прасіў яе там, дзе Ён пачуваўся не ў сябе, стала такой важнай апорай. Святы Ян не хавае, што неабходнасць прасіць гасціннасці ў недружалюбнай краіне было цяжкім досведам таксама для Езуса.

Ля калодзежа Якуба самаранка спачатку намякае, што Яго тут не вітаюць. Ён адчувае, што яна вырашае, будзе Ён піць альбо ж не. Крыху здзекуецца з Яго: «У Цябе і зачарпнуць няма чым». Але Езуса не турбуюць яе кпіны. Далікатна адварочвае сітуацыю. З таго, хто пачаў прасіць пра невялікую паслугу - пітную ваду, - становіцца тым, хто прапануе ў часе размовы неперасягненую гасціннасць: крыніцу, якая ніколі не скончыцца.

Каб сустрэцца з тымі, з кім у нас няма адносін, складана. Лягчэй прапанаваць гасціннасць, чым пакорліва прасіць пра яе. Аднак Езус паказвае шлях: калі мы даём зразумець, што нам патрэбна гасціннасць ад незнаёмых людзей, мы таксама можам прапанаваць яе некаму яшчэ.

## Пытанні для абмену думкамі ў малых групах:

► Чаму Езус паставіў сябе ў сітуацыю, калі яму патрэбна гасціна на варожай тэрыторыі?

► Што характарызуе гасціннасць, якую мы прапануем, а што тую, якую мы атрымліваем?

► Калі я адчуваю сябе лепш, калі праяўляю гасціннасць ці калі яе атрымліваю? Як я сябе адчуваю, калі мне трэба некага прасіць пра тое?